УДК 391:793.31(476.5)“10/20”

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ НАРОДНАГА АДЗЕННЯ І ПОБЫТАВАГА ТАНЦА ЯК МАСТАЦКАЯ СІСТЭМА Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ XI–XXI СТАГОДДЗЯЎ

***Бабровіч Г.А.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

*Прапанаванае даследаванне з’яўляецца працягам мастацтвазнаўчага аналізу і сістэматызаванага разгляду тэматычна-відавой класіфікацыі побытавых танцаў і традыцыйнага адзення Віцебшчыны, распачатага аўтарам у папярэднім артыкуле дадзенага часопіса пад назвай “Спецыфічныя адрозненні касцюмных комплексаў выканаўцаў народных побытавых і народна-сцэнічных танцаў”. З вызначанай раней мэтай распрацоўкі дакладных рэкамендацый па выкарыстанні традыцыйных комплексаў народнага адзення адпаведна з месцам бытавання танца і касцюма ў мінулым, узростава-палавой і сацыяльнай дыферэнцыяцыяй былых носьбітаў, рознымі этапамі аднаўлення дадзенага фальклорнага жанру сістэматызуюцца звесткі па краязнаўчых і літаратурных крыніцах, музейных і іншых фондах, якія захавалі сляды існавання мясцовай спадчыны ў мінулым і сучасным аўтэнтычным асяроддзі. Акцэнт зроблены менавіта на гістарычнай рэтраспекцыі ўзнікнення і развіцця розных з’яў двух значных відаў народнага мастацтва ў іх гарманічным спалучэнні – адзення і танца.*

***Ключавыя словы:*** *аўтэнтычны (традыцыйны) строй, Віцебшчына, касцюмны комплекс, народнае адзенне, Паазер’е (Падзвінне), Падняпроўе, Панямонне, карагод (танок), народны (побытавы) танец.*

# INTERACTION OF FOLK CLOTHING AND HOUSEHOLD DANCE AS AN ARTISTIC SYSTEM IN THE TRADITIONAL CULTURE OF THE XI$^{TH}$–XXI$^{ST}$ CENTURY VITEBSK REGION

***Babrovich G.A.***
*Education Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

*This study is a continuation of the art history analysis and systematic study of the thematic and specific classification of household dances and traditional clothing of Vitebsk Region, started by the author in the previous article “Specific differences in costume complexes of performers of folk household and folk stage dances”. Taking into account the previously defined goal of developing detailed recommendations on the use of traditional folk clothing complexes, according to the place of dance and costume in the past, age-differences and social differentiation of former carriers, the various stages of recreating this folklore genre, information on local history and literary sources, museum and other funds that have preserved traces of the existence of local heritage in the past and modern authentic environment are systematized. The emphasis is placed on the historical retrospection of the emergence and development of various phenomena of the two significant types of national art in their harmonious unity-clothing and dance.*

***Key words:*** *authentic (traditional) costume, Vitebsk Region, costume complex, folk clothes (costumes), Poozeriye (Podvinye), Podneprovye, Ponemanye, round dance (tanok), folk-stage dance.*